ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№4 (1057) | ЧАЦВЕР, 26 лютага 2004 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СХІЛЯЕМ ПЕРАД ВАМІ ГАЛАВУ

**23-га лютага краіна ў 86 раз адзначыла Дзень абаронцаў Айчыны.**

Па традыцыі ў гэты дзень ва універсітэцкім студэнцкім парку да магілы загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны воінаў, партызан і падпольшчыкаў былі ўскладзены вянкі і кветкі ад кіраўніцтва ГДУ, грамадскіх, мала-дзёжнай арганізацый.

На жаль, бег часу няўмольны, і год за годам радзеюць рады былых абаронцаў Радзімы. Ва універсітэцкай арганізацыі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы сёння стаяць на ўліку 24 чалавекі. Самыя цёплыя словы віншаванняў і найлепшых пажаданняў адрасавалі ім на разасланых па хатніх адрасах маляўнічых паштоўках кіраўніцтва універсітэта, Савет жанчын, прафсаюзныя арганізацыі, камітэт БРСМ.



Напярэдадні свята гасцямі першакурснікаў філалагічнага факультэта былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Васіль Васільевіч Крывіч і Віктар Міхайлавіч Рупін. Яны ўспаміналі сваю абпаленую вайной маладосць, якая праходзіла ў баях за вызваленне Радзімы ад гітлераўскіх захопнікаў, баявое братэрства, што дапамагло выстаяць, адолець жорсткага ворага, дайсці да Берліна і сустрэць доўгачаканую перамогу.

**На здымку: кветкі ад моладзі – ганаровым і паважаным гасцям.**

Фота У. ЧЫСЦІКА.

## БЫЦЬ ТУТ НОВЫМ СПАРТЫЎНЫМ РЭКОРДАМ!

**Завершана будаўніцтва доўгачаканага і вельмі важнага для нашага універсітэта аб'екта — вучэбна-спартыўнага комплексу па вул. Песіна, 70. Дзяржаўная камісія падпісала акт аб прыёмцы яго ў эксплуатацыю. Падзея гэта — вельмі радасная і прыемная для выкладчыкаў і студэнтаў ГДУ, і цяпер заняткі па фізічнай культуры, разнастайныя спартыўныя спаборніцтвы будуць праходзіць у сучасных, камфортных умовах.**

**Доўгім быў шлях да гэтай, па вялікім рахунку, гістарычнай падзеі. Кропка яе адліку пачыналася амаль 10 гадоў таму назад, калі кіраўніцтва ГДУ ў сувязі з вострым дэфіцытам спартыўных плошчаў звярнулася ў гарвыканкам з просьбай аб перадачы на баланс універсітэта будынка, у якім размяшчалася трансагенцтва. Рашэнне гарадскіх улад ад 15 чэрвеня 1994 г. было станоўчым — ГДУ перадалі на баланс названы будынак і замацавалі адпаведны зямельны ўчастак. У верасні 1996 г. паміж Міністэрствам адукацыі і навукі і Гомельскім аблвыканкамам быў заключаны дагавор аб далявым удзеле ў фінансаванні рэканструкцыі аб'екта пад спартыўны корпус ГДУ. Так была адкрыта новая старонка ў развіцці і пашырэнні матэрыяльнай базы ГДУ і яе стваралі агульнымі намаганнямі абласная выканаўчая ўлада, праектныя, будаўнічыя арганізацыі («Гомельграмадзянпраект», БУ-185 трэста №27, «Белэлектрамантаж», «Тэхнабуд») і, безумоўна, сам універсітэт. Словы шчырай падзякі трэба адрасаваць аблвыканкаму, які фінансаваў усе будаўнічыя работы і набыццё неабходнага абсталявання, мэблі, спартыўнага інвентару.**




(Матэрыял пра новы спартыўны корпус чытайце на 2-й старонцы газеты).

## АБ'ЯЎЛЕНА ПАДЗЯКА

***За актыўную работу па кіраўніцтву Саветам рэктараў ВНУ Гомельскай вобласці, вялікі асабісты ўклад у развіццё Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны, падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, шматгадовую плённую навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць старшыні Савета рэктараў ВНУ Гомельскай вобласці, прафесару ГДУ СЕЛЬКІНУ Міхаілу Васільевічу Гомельскім аблвыканкамам аб'яўлена падзяка.***

## НА РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОРУМ

92 дэлегаты з вышэйшых навучальных устаноў будуць прадстаўляць Гомельшчыну на Рэспубліканскія студэнцкім форуме, які адбудзецца 27-29 студзеня ў сталіцы Беларусі. 24 чалавекі – выдатнікі вучобы, актыўныя ўдзельнікі навукова-даследчай работы, грамадскага жыцця ўвайшлі ў склад дэлегацыі ад нашага універсітэта.

У час работы форуму, у якім прымуць удзел Прэзідэнт краіны А. Лукашэнка, міністр адукацыі А. Радзькоў, іншыя адказныя асобы міністэрстваў і ведамстваў, выканаўчых і распарадчых органаў, студэнты абмяркуюць важныя пытанні аб узмацненні сацыяльнай абароненасці навучэнцкай моладзі, пашырэнні яе ўдзелу ў вырашэнні эканамічных, сацыяльных і культурных праблем грамадства.

***

**С 23 по 27 февраля с 10-00 до 20-00 организована работа «горячей линии». Вы можете обратиться с насущными и проблемными вопросами к любому должностному лицу государства.**

**«Горячая линия» – (017) 220-84-91**
**ИНФО-линия ЦК 00 «БРСМ» (017) 222-37-37**

Комитет БРСМ университета совместно с профсоюзным комитетом студентов организовали горячую линию по телефонам: **56-73-90 и 57-16-11.**

## СТЫПЕНДЫЯТЫ ПРАФСАЮЗА

Грамадская работа, калі ёй займацца з пачуццём адказнасці, патрабуе і сіл, і энергіі. У студэнцкім асяроддзі ГДУ тых, хто прысвячае ёй нямала часу, – шмат. Яны паспяваюць і ў вучобе, і ў прафсаюзных справах. Іх дзелавітасць, стараннасць ацэньваюцца па заслугах. Па добрай традыцыі прафкам студэнтаў заахвочвае матэрыяльна лепшых прафоргаў факультэтаў спецыяльнымі стыпендыямі. У бягучым навучальным семестры яны прызначаны чацвёртакурсніку юрфака Аляксею Калесніку, студэнту 5 курса факультэта фізічнай культуры Дзмітрыю Васількову, трэцякурсніку біяфака Аляксею Багданаву, студэнтцы 4 курса матэматычнага факультэта Алене Прыходзька, другакурсніцы фізічнага факультэта Ірыне Грачанковай і студэнтцы 3 курса факультэта замежных моў Надзеі Амельчанка.

Прафсаюзная стыпендыя складае адну базавую велічыню і выплачваецца дадаткова да вучэбнай.

Трэцякурсніку гістарычнага факультэта Аляксандру Грахоцкаму ўстаноўлена стыпендыя абласной прафсаюзнай арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Яе памер – 1,5 базавай велічыні.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За плённую навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з Днём беларускай навукі Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны: загадчык кафедры эканамічных тэорый д.э.н. Барыс Уладзіміравіч* ***Сарвіраў,*** *дэкан факультэта фізічнай культуры д.п.н. Генадзь Іванавіч* ***Нарскін****, д.ф.н., прафесар кафедры беларускай літаратуры Валянціна Станіславаўна* ***Новак,*** *д.г.н., прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі Рыгор Рыгоравіч* ***Лазько,*** *д.ф.-м.н.,дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі Адольф Рувімавіч* ***Міроцін****, загадчык кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў дацэнт Алена Юр'еўна* ***Трацэўская****, дацэнт кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі Мікалай Уладзіміравіч* ***Гапановіч-Кайдалаў****, дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі Віктар Мікалаевіч* ***Мышкавец****, дацэнт кафедры крымінальнага права і працэсу Яўген Валер'евіч* ***Багданаў,*** *ст.-выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы Галіна Мікалаеўна* ***Ігнацюк****.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі* ***ЖАЛОНКІНА Тамара Пятроўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 55-годдзем з дня нараджэння к.т.н., дацэнт кафедры агульнай фізікі* ***КУПРЭЕЎ Міхаіл Пятровіч*** *узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую працу, добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў метадыст вучэбнага аддзела* ***СТАРАКОЖАВА Валянціна Іванаўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканаты фізічнага факультэта і факультэта фізічнай культуры горача віншуюць **АЛЯШКЕВІЧА Мікалая Аляксандравіча** з кафедры оптыкі і **БАНДАРЭНКА Алу Яўгенаўну** з кафедры АЛФК з прысваеннем ім Прэзідыумам ВАКа Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры АСАІ горача віншуюць асістэнта названай кафедры **НІКІШАЕВА Васіля Аляксандравіча** з паспяховай абаронай у спецыялізаваным Савеце універсітэта дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук (навуковы кіраўнік – дацэнт А.М. Дземідзенка).

## ДЫПЛОМ ЗА САМАДЗЕЙНУЮ ТВОРЧАСЦЬ

Поспехі студэнцкага клуба нашага універсітэта ў развіцці разнастайных напрамкаў самадзейнай творчасці моладзі шырока вядомы не толькі ў абласным цэнтры, у рэспубліцы, але і нават у далёкім замежжы. Дастаткова нагадаць Міжнародны маладзёжны фестываль "Арт-сесія", ініцыятарам і арганізатарам якога з'явіўся менавіта ГДУ. Пры студэнцкім клубе працуе шмат творчых калектываў, 8 з якіх носяць ганаровае званне "народны".

Універсітэцкія таленты таксама заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у розных культурных праграмах, конкурсах-аглядах, канцэртах студэнцкай моладзі нашага абласнога цэнтра. Нядаўна па выніках конкурсу студэнцкіх талентаў, які праводзіўся ў Цэнтральным раёне г. Гомеля, ГДУ быў удастоены Дыплома за лепшую арганізацыю работы па развіцці самадзейнай творчасці.

# В ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЕ НЕ ДОЛЖНО БЫТЬ ВАКУУМА

А. ЛЫСЕНКОВ, проректор по воспитательной работе

**Важнейшей составной частью идеологической и воспитательной работы в вузе является изучение общественного мнения студенчества. Оно проводилось в университете кафедрой политической социологии (зав. – доцент А.Е. Рычков). Результаты социологических исследований в рамках вузовского мониторинга качества обучения и воспитания дают видение реальной идеологической ситуации в студенческом сообществе.**

В целом студенческая молодежь ориентируется на общественно значимые ценности. В числе качеств, которыми должен обладать современный молодой человек, фигурируют такие, как порядочность, оптимизм, готовность к переменам в жизни, терпимость, гуманность, трудолюбие, нравственность. Вместе с ними в одном ряду оказались деловая «хватка», индивидуализм. Низкой является значимость коллективизма, патриотизма, социальной активности.

Патриотом своей страны считают себя 42,6% опрошенных, каждый третий (31,3%) затрудняется дать ответ на этот казалось бы ясный вопрос. Сложившееся представление о политической пассивности студенческой молодежи имеет мало общего с действительностью. Интерес студентов к политике стоит на втором месте и лишь несколько уступает интересу к культуре. Политикой в разной степени интересуются 63,5% опрошенных, т.е. две трети студентов.

К сожалению, социально-активные студенты, которые имеют свою точку зрения по отношению к событиям общественно-политической жизни страны и могут отстаивать ее, не составляют в студенческой среде большинства. Значительной является доля студентов, которые имеют свое мнение, но по разным причинам не хотят или не могут выражать и отстаивать его.

Наличие осознанной позиции является важной предпосылкой формирования гражданских качеств у студентов вне зависимости от их ориентации на конкретные социально-политические силы.

Не случайно поэтому и то, что большинство студентов имеет правильное представление о своей роли в политической жизни страны, ориентировано на проявление созидательной политической активности. Три четверти опрошенных уверены в том, что политическая активность прежде всего заключается в участии в выборах. Две трети студентов (64,4%) полагают, что политическая активность проявляется в участии в деятельности политических партий и общественных организаций. Треть студентов (33%) считает, что политическая активность должна носить «митинговый» характер и проявляться в участии в акциях протеста, забастовках и т.п.

Половина опрошенных студентов (48,7%) прямо говорит о том, что система воспитания студенческой молодежи нужна: Выражает сомнение в ее необходимости четверть опрошенных (26,1%), столько же студентов затрудняются выразить свое мнение.

Более половины студентов полагают, что в вузе прежде всего нужны такие направления воспитания, как эстетическое, нравственное, семейно-бытовое, патриотическое.

Какие студенческие организации нужны сегодня в вузе? Вот мнение самих студентов. Прежде всего, считают 75% опрошенных, это студенческий профсоюз и профком. Во-вторых, студенческий отдел кадров (55,7%). В-третьих, необходим студенческий союз вуза (47%). Несколько более – 40% студентов считают, что в вузе нужны организации самоуправления в студенческих группах и общественно-политические молодежные организации.

В связи с этим важнейшая задача государственной молодежной политики Республики Беларусь на современном этапе развития нашего общества состоит в том, чтобы осуществлять подготовку квалифицированных специалистов для народнохозяйственного комплекса страны, формировать гармоничную, идеологически и нравственно подготовленную к самостоятельной трудовой и творческой деятельности личность гражданина страны.

В каждом учебном заведении имеются собственные ноу-хау в области информационно-воспитательной работы со студентами. Среди основных форм этой внутривузовской деятельности – целый ряд мероприятий, пользующихся признанием как в молодежной среде, так и в профессорско-преподавательском коллективе университета.

В ГГУ действует отлаженная система информационно-воспитательной работы: проводятся еженедельные планерные совещания у ректора руководителей структурных подразделений университета, на которых рассматривается и обсуждается информация, поступающая из государственных источников. Она доводится деканами и заместителями деканов по воспитательной работе на еженедельных планерных совещаниях до заведующих кафедрами и далее транслируется на кураторов, старост студенческих групп и всех сотрудников и студентов университета.

Методическую помощь деканам и их заместителям по воспитательной работе, кураторам, воспитателям общежитий, старостам учебных групп, представителям организаций БРСМ, студенческого профсоюза оказывает созданная в университете информационно-аналитическая служба.

Помимо объемной и разноплановой воспитательной деятельности, которая успешно ведется на факультетах, в спортклубе, ректорат университета постоянно ищет новые формы и методы идейно-воспитательной работы со студенческой молодежью. Общеизвестно, что в воспитании, как и в социально-политической и культурной жизни людей важное значение имеет информационно-пропагандистская работа по всем направлениям. И педагоги заинтересованы в том, чтобы следующее поколение работников умственного труда было не только хорошо образовано в области естественнонаучных и гуманитарных знаний, но и получило хорошую базу духовно-нравственных знаний, практических умений и навыков, необходимых для дальнейшей взрослой плодотворной деятельности.

З абласнога семінара

# АБ ПРАВЯДЗЕННІ АДЗІНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНА

Як вядома, Правіламі прыёму ў ВНУ на 2004 год прадугледжана правядзенне адзінага дзяржаўнага экзамена па беларускай і рускай мовах у форме цэнтралізаванага тэсціравання. Паколькі для сярэдніх школ гэта справа прынцыпова новая, у настаўнікаў узнікае шмат пытанняў.

З мэтай азнаямлення школьных педагогаў з найбольш эфектыўнымі метадамі і формамі работы па падрыхтоўцы вучняў да тэсціравання ўпраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкама, абласным інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, ГДУ нядаўна быў праведзены абласны семінар-практыкум па тэме: "Арганізацыйна-метадычныя асновы правядзення экзамена па беларускай і рускай мовах у форме цэнтралізаванага тэсціравання".

Настаўнікі-прадметнікі ўсіх раёнаў Гомельшчыны, а таксама абласнога цэнтра, г. Мазыра атрымалі вычарпальную інфармацыю аб тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання, яго мадэлях, мэтах і задачах увядзення новай формы атэстацыі вучняў агульнаадукацыйных школ, азнаёміліся з методыкай работы настаўніка-моваведа па падрыхтоўцы школьнікаў да тэсціравання. Праводзіліся таксама практыкумы па вывучэнні ўзроўню гатоўнасці настаўнікаў да ажыццяўлення дзейнасці па падрыхтоўцы вучняў да выканання тэставых заданняў.

Перад удзельнікамі семінара выступілі работнікі абласнога ІПК, вопытныя педагогі сярэдніх школ г. Гомеля, Беларуска-славянскай гімназіі №36 імя І. Мележа, а таксама выкладчыкі філалагічнага факультэта нашага універсітэта І.І. Кобыш, Т.І. Багаедава, В.С. Новак, Л.П. Кузьміч, А.М. Палуян.

Прафсаюзнае жыццё

# АХОВУ ПРАЦЫ – ПАД ГРАМАДСКІ КАНТРОЛЬ

У працоўных калектывах для больш поўнай рэалізацыі дадзеных прафсаюзам правоў за захаваннем заканадаўства дзейнічаюць грамадскія інспектары па ахове працы. Ім нададзены паўнамоцтвы правяраць выкананне наймальнікам умоў Калектыўнага дагавора, патрабаваць ухілення недахопаў і парушэнняў, звязаных з незахаваннем правілаў тэхнікі бяспекі, і інш.

У кожным структурным падраздзяленні нашага універсітэта таксама ёсць грамадскія інспектары. Усяго іх – 26. Нядаўна з імі былі праведзены чарговыя вучэбныя заняткі, якія вялі начальнік аддзела аховы працы і тэхнікі бяспекі ГДУ М.С. Новікаў і старшыня камісіі прафкама па ТБ А.М. Семянкоў. Грамадскія інспектары атрымалі адпаведныя пасведчанні.

Зараз у рэспубліцы праводзіцца агляд-конкурс на лепшую арганізацыю прафсаюзамі грамадскага кантролю па ахове працы. Яго мэта – садзейнічаць рэалізацыі правоў работнікаў на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу будзе дадзена ацэнка ўкладу грамадскіх інспектараў у вырашэнне маючых месца праблем па паляпшэнні ўмоў працы. Універсітэт таксама прымае ўдзел у гэтым конкурсе. Грамадскія інспектары ўсіх факультэтаў, падраздзяленняў прадставілі ў прафкам свае справаздачы аб праведзенай рабоце. На думку членаў камісіі прафкама па ТБ, звання "Лепшы грамадскі інспектар па ахове працы" заслугоўваюць ст. выкладчык кафедры агульнай фізікі У.А. Замятнін, які на працягу многіх гадоў актыўна займаецца пытаннямі тэхнікі бяспекі на фізічным факультэце і дзе ў апошні час назіраюцца вялікія станоўчыя зрухі ў рабоце па дадзеным напрамку. Высокая ацэнка дадзена і рабоце старшынь прафбюро матэматычнага і эканамічнага факультэтаў В.Л. Мяржы і А.Л. Вайцішкінай. На апошнім пасяджэнні прафкама зацверджана гэта рашэнне аб прысваенні званняў лепшых грамадскіх інспектараў. Адзначана таксама мэтанакіраваная і эфектыўная дзейнасць камісіі прафкама па тэхніцы бяспекі, якую ўзначальвае А.М. Семянкоў.

# БЫЦЬ ТУТ НОВЫМ СПАРТЫЎНЫМ РЭКОРДАМ!

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 1-й стар.)

...Новы будынак пакуль не звініць галасамі студэнтаў – заняткі тут яшчэ не праводзяцца. Паўсюдна, пачынаючы ад прылягаючай тэрыторыі, узорная чысціня і парадак, як і мае быць на толькі што здадзеным членам кампетэнтнай і прыдзірлівай камісіі аб'екце.



Карэспандэнта універсітэцкай газеты, які завітаў сюды з мэтай усё ўбачыць на ўласныя вочы і падрабязна расказаць аб гэтым чытачам, сустрэў паўнаўладны гаспадар новага дома, яго камендант В.Ц. Лысы. Васіль Ціханавіч да драбніц ведае свае "уладанні", бо ўзначаліў іх не зараз, калі ўсё блішчыць, зіхаціць і гатова да эксплуатацыі, а некалькі месяцаў назад. Тады тут яшчэ кіпела работа будаўнікоў, аддзелачнікаў, электрыкаў і інш. І ён асабіста, разам са студэнтамі, выкладчыкамі вынес адсюль нямала смецця, працаваў разам з імі па навядзенні такога, як зараз, парадку.

Ажыўлена штосьці абмяркоўвалі каля ўваходу юнакі (як высветлілася, з хвіліны на хвіліну тут чакалі прыезду машыны з мэбляй з г. Рэчыцы, і студэнтаў факультэта фізічнай культуры папрасілі дапамагчы пры яе разгрузцы). А пакуль быў яшчэ час, Васіль Ціханавіч павёў мяне ў захапляючае "падарожжа".

Яно пачалося з пакоя для абслугоўваючага персаналу. Сюды, на пульт кіравання, як ён растлумачыў, зводзіцца ўся ахоўная і пажарная сігналізацыя будынка, за якой сочаць вартаўнікі – дзённыя і начныя (іх на працу прынята 4 чал.). Спецыяльныя датчыкі падведзены да кожнага вакна першага паверха, таму няма ніякай патрэбы ва ўмацаванні іх рашоткамі. Высокаэфектыўная, сучасная вентыляцыйная сістэма здольная падтрымліваць аптымальную тэмпературу на ўсіх паверхах корпуса, рэгуляваць яе, пры неабходнасці падаючы падагрэтае каларыферамі паветра туды, дзе цяпла не хапае, і наадварот.

Вялікую плошчу першага паверха займае барцоўская зала (для класічнай і вольнай барацьбы, усходніх адзінаборстваў). Пакуль тут яшчэ не зроблена адпаведная разметка на падлозе, няма на ёй і неабходнага пакрыцця – дываноў, татамі і інш. Побач з залай – жаночая і мужчынская раздзявальні, душавыя з устаноўленым і дзеючым сантэхнічным абсталяваннем. Засталося даўкамплектаваць іх неабходнай мэбляй, якая ўжо закуплена.

Падымаемся па лесвіцы на другі паверх. Заняткі па агульнафізічнай падрыхтоўцы, прадугледжаныя для студэнтаў усіх факультэтаў, плануецца праводзіць у прасторнай і светлай трэнажорнай зале, дзе таксама пакуль прадугледжанае абсталяванне адсутнічае. Уверсе, на адной са сцен, Васіль Ціханавіч паказвае ўстаноўленыя гучнагаварыцелі, якія будуць выкарыстоўвацца выкладчыкамі пры неабходнасці на занятках для розных аб'яў, каменціравання спаборніцтваў, музычнага суправаджэння і г.д. Камфортны тэмпературны рэжым у зале ў час заняткаў фізічнай падрыхтоўкай, на трэнажорах можна будзе ствараць і атрымліваць пры дапамозе сучаснай вентыляцыйнай сістэмы, якая забяспечыць прыток дастатковай колькасці свежага паветра.

Навасёламі корпуса стануць выкладчыкі і лабаранты агульнауніверсітэцкай кафедры фізічнага выхавання і спорту. Тут для іх і загадчыка дацэнта К.К. Бандарэнкі выдзелены адпаведныя ўтульныя кабінеты. Прадугледжаны для выкладчыкаў, лабаранцкага саставу добрыя бытавыя ўмовы: пасля правядзення заняткаў можна прыняць душ, пераапрануцца. У перспектыве ў новы корпус перабазіруецца таксама спартыўны клуб універсітэта, размесціцца тут і навуковая лабараторыя кафедры фізвыхавання.

А сапраўднай гордасцю ўсяго новага спорткомплексу В.Ц. Лысы назваў трэцюю па ліку і самую вялікую залу – спартыўных гульняў. Тут будуць праводзіцца трэніроўкі і спаборніцтвы па валейболу, баскетболу, бадмінтону, ручному мячу. Яна і сапраўды ўражвае: аб'ёмная, каля 7-мі метраў вышынёй, падлога – з выдатнага матэрыялу.

У гэтай зале таксама яшчэ не ўсё гатова для эксплуатацыі – неабходна ўстанавіць на вокнах ахоўныя сеткі, якія заказаны і закуплены ў г. Мінску. Для тэхнічнага абслугоўвання (напрыклад, устаноўкі і замены лямп асвятлення, уцяплення аконных рам і г.д.) у зале знаходзіцца вышка з сучасных сплаваў, якую лёгка перамяшчаць у патрэбнае месца.

Не было б поўным уяўленне пра новы універсітэцкі аб'ект без знаёмства з усімі тэхнічнымі тонкасцямі спартыўнага корпуса, які радуе, уражвае і здзіўляе. Яны, у асноўным, знаходзяцца ў падвальным, цокальным памяшканні, якое мы таксама наведалі. Васіль Ціханавіч дэталёва, даходліва, тэхнічна граматна расказаў і пра "цеплавое сэрца" будынка, якое працуе на поўнай аўтаматыцы, што не дапускае перарасходу гігакалорый, і пра высокаэфектыўныя сістэмы водазабеспячэння, пажаратушэння, вентыляцыі. Усё гэта адпавядае самым сучасным патрабаванням. Адчувалася кампетэнтнасць каменданта ва ўсіх гэтых пытаннях, і я яшчэ раз упэўнілася ў тым, што ў такога дбайнага гаспадара новага дома заўсёды ўсё будзе ў належным парадку. А дапамагаць яму ў гэтым будуць штатныя работнікі: слесар-сантэхнік, электраманцёр, дворнікі, прыбіральшчыцы і старажы.

Што і казаць, добры падарунак атрымаў наш універсітэт. Давесці ў новым корпусе ўсё да ладу, каб хутчэй поўнасцю задзейнічаць яго ў вучэбным працэсе, – задача для ўсіх зараз самая надзённая. Тады запульсуе тут паўнакроўнае жыццё і абавязкова будуць устанаўлівацца новыя спартыўныя рэкорды...

Т.НІКАЛАЕВА.



*На здымку: зала спартыўных гульняў.*

*Фота В. ЧЫСЦІКА.*

Конкурсы, выставы

# НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ВЫБІРАЕ...

**У нашым універсітэце на базе фізічнага факультэта прайшлі выстава і конкурс тэхнічнай творчасці сярод школьнікаў г. Гомеля. На гарадскім узроўні такі конкурс праводзіцца ўпершыню, а на абласным і рэспубліканскім – ужо не раз.**

Выбар месца правядзення конкурсу абумоўлены тым, што на постсавецкай прасторы толькі на фізічным факультэце ГДУ ёсць спецыяльнасць "Фізіка і тэхнічная творчасць". Арганізавалі мерапрыемства Аддзел адукацыі Гомельскага гарвыканкама, гарадскі камітэт БРСМ, ГДУ імя Ф. Скарыны.

Экспанаты гарадскіх талентаў размяшчаліся, як заўсёды, у выставачнай зале універсітэта. Цікавымі, зробленымі творча і прыгожа, без перабольшвання, былі ўсе мадэлі. Адны ўражвалі сваёй складанасцю (чыгуначны, авіа- і суднамадэлізм, радыёэлектроніка), другія прываблівалі эстэтычнасцю, вытанчанасцю (драўляная скань (філігрань), вырабы з саломкі, пано, гліняныя сувеніры, габелены, вышыўка і інш.). Неардынарна і надзвычай прыгожа былі афомлены дасягненні астраклуба "Цырус". Падлеткі, якія не першы год сур'ёзна займаюцца "справамі нябеснымі", зрабілі стэнд фотаздымкаў астранамічных аб'ектаў: зорак, планет, метэорнай плыні "Леаніды", зацьменняў Месяца і Сонца. Таксама былі прадстаўлены мадэлі астралагічных прылад.

Яны складаліся па трох узроставых групах: 8-9, 10, 11 класы. Заданні былі падрыхтаваны ст. выкладчыкамі кафедр: фізічнай электронікі – Уладзімірам Іванавічам Кандраценкам і агульнай фізікі – Ігарам Мікалаевічам Якаўцовым. Другі тур – навукова-практычная канферэнцыя па трох секцыях. На іх абмяркоўваліся даклады ўдзельнікаў, якія ў большасці выпадкаў суправаджаліся натурнай дэманстрацыяй распрацовак. Значную дапамогу ў правядзенні конкурсу аказалі студэнты 5-га курса фізічнага факультэта Павел Бордак, Аляксей Брэдзіхін і Аляксандр Пабіяха.



*Вучань 8 класа СШ №17 Сяргей Гумар прадстаўляў на конкурс сканструяваную ім мадэль электрамагнітнай хвалі і стаў адным з пераможцаў у секцыі "Радыёэлектроніка". Юнак актыўна займаецца тэхнічнай творчасцю ў гуртку радыёэлектронікі ГСЮТ, якім кіруе Вячаслаў Іванавіч Паўлюковіч.*

У першай секцыі – "Радыёэлектроніка", работу якой праводзілі і ацэньвалі ст. выкладчык кафедры агульнай фізікі І.М. Якаўцоў і асістэнт кафедры фізічнай электронікі У.П. Марозаў, былі прадстаўлены распрацоўкі прылад з арыгінальнымі схематэхнічнымі і канструктарскімі рашэннямі. Напрыклад, васьмікласнік СШ №8 Арцём Васількоў растлумачыў будову і прынцыпы дзеяння сканструяванага ім аўтаматычнага мікшэра, які выкарыстоўваецца на дыскатэках. Як прызнаўся Арцём, электроніка вабіць яго з ранняга дзяцінства. Пачынаў з простага – гірлянды для ёлкі, а ў мінулым годзе прачытаў аб'яву радыёгуртка Гомельскай станцыі юных тэхнікаў, і яму пашанцавала: знайшоў тое, што шукаў. Пакуль для яго электроніка – гэта хобі, але вельмі цікавае, займальнае.



*З захапленнем і цікавасцю слухаюць першакласнікі СШ №44 расказ удзельніка і прызёра конкурсу тэхнічнай творчасці вучня 10 класа СШ №30 Іларыёна Цыгана аб мадэлях ракет.*

На ўрачыстым адкрыцці выставы выступіў дырэктар Гомельскай станцыі юных тэхнікаў Міхалай Максімавіч Бельчыкаў. Ён падзякаваў тым, хто дапамог рэалізаваць тэарэтычныя і практычныя мэты мерапрыемства: в.а. рэктара ГДУ прафесару С.Ф. Каморнікаву, выкладчыкам фізічнага факультэта, спонсарам, дзецям і многім іншым. Дэкан фізічнага факультэта Сяргей Вікенцьевіч Шалупаеў прадставіў членаў журы і выказаў пажаданне, каб гарадскі конкурс стаў традыцыйным. Першы сакратар гарадской арганізацыі БРСМ Андрэй Белякоў падкрэсліў думку аб тым, як шмат сярод школьнікаў талентаў і пад прафесійным кіраўніцтвам яны могуць сябе рэалізаваць.

Конкурс прайшоў у два туры, вынікі кожнага з якіх ацэньвала журы. Першы з іх – тэарэтычны, на якім школьнікі рашалі фізічныя задачы з тэхнічным зместам.

